Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР. Тэл. 24271 і 23280.

№ 15 (128) | 1—10 лістапада | 1933 г.

ЗМЕСТ

СІНАПТЫЧНЫ АГЛЯД.

У першы дзень дэкады тэрыторыя БССР знаходзілася пад уплывам грэбня павышанага ціску, які складаўся з мас кантынентальнага палярнага паветра і рухаўся на ўсход.

2, 3 і 4 ліку тэрыторыя Беларусі была занята вобласцю паніжанага ціску—лагчынай, якая складалася з мас няўстойлівага марскога палярнага паветра, таму ў гэтыя дні па БССР наглядалася пахмурнае і дажджлівае надвор'е.

Тым часам з Заходняй Эўропы рухаўся антыцыклон, які складаўся з больш халодных мас марскога палярнага паветра, што выклікала ў БССР невялікае паніжэнне тэмпературы да —2, +1° ноччу. У гэты-ж момант з боку Румыніі праз Зах. Украіну, у паўночным напрамку, рухаўся цыклон, які складаўся з мас трапічнага паветра, дзякуючы чаму на поўдні БССР наглядалася пахмурнае з марасячымі дажджамі надвор'е пры больш высокіх

Табліца вынікаў метеаралагічных

	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Часло. калі наглід. мінімум
(Вазерны)	2	Дрыса . . .	4	5	4	4	4	3	1	—1	0	1	—	2	—	8	—2	8
	3	Полацак . .	5	5	5	4	3	2	2	—1	0	1	—	3	1	8	—1	9
	68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва . . .	4	6	4	3	3	2	0	—2	—3	1	—	2	—	8	—7	9
(Вадападзельны)	8	Лепель . .	4	4	5	3	3	2	2	1	0	1	—	2	—	7	—2	8
	15	Сянно . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў . .	5	5	4	3	2	2	1	0	0	1	—	2	1	8	—3	9
	16	Менск . .	4	4	3	3	1	2	1	0	0	0	—	2	2	9	—3	9
	93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	5	4	4	4	1	2	1	0	0	1	—	2	2	8	—2	10
	25	Асіпавічы .	4	5	4	5	1	2	2	1	1	2	—	3	2	11	—3	9
	10	Орша . .	6	7	5	3	3	2	1	0	—1	1	—	3	1	11	—2	9
	19	Горкі . .	6	6	5	4	2	2	1	—1	—2	1	—	2	1	11	—3	10
(Раўнінны)	89	Клічаў . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак . .	5	4	5	5	3	3	2	1	1	1	—	3	—	—	—1	9
	119	Ратміравічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны .	5	5	6	4	2	3	2	1	1	1	—	3	2	8	—3	6
	21	Магілеў . .	6	7	5	4	2	2	2	—2	—1	1	—	3	1	11	—2	9
	73	Чавусы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў . .	8	6	5	4	2	3	2	0	—1	0	—	3	1	11	—3	9
	171	Касцюковічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск . . .	8	7	5	5	3	3	2	1	0	1	—	3	2	12	—2	9
	32	Жлобін . .	7	7	5	5	3	3	2	1	—1	1	—	3	2	11	—2	9
(Нізінны)	33	Жыткавічы .	6	6	6	5	3	4	3	2	2	2	—	4	2	9	—1	6
	37	Калінкавічы .	7	7	7	6	4	3	3	1	1	2	—	4	2	11	—1	6
	39	Лельчыцы .	4	6	7	6	4	4	4	2	1	2	—	4	—	10	—1	10
	85	Чачэрск . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба . . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель . .	8	9	6	6	5	3	4	1	—1	1	—	4	2	12	—2	9
	35	Васілевічы .	7	8	6	6	4	2	3	1	0	1	—	4	2	12	—2	9
	40	Людвінава .	9	8	5	5	7	6	4	5	2	1	—	5	2	13	—3	10
	242	Красілаўка .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

назіранняў за 1—10 лістапада 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм.												Метэаралагічная з'яв (у дужках азначаны чыслы)
	Максім.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	1	2	3	4	5	6	7	8	9	10		Сума	
76	—	—	—	2.0	0.6	8.0	0.1	0.1	1.0	2.0	0.5	1.0	1.0	—	16.3	туман (5)
79	—	—	—	7.0	..	6.0	..	..	11.0	3.0	0.1	..	1.0	—	28.1	туман (2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	9.0	..	5.0	..	..	4.0	0.5	0.2	..	..	—	18.7	—
72	9	—9	10	22.0	..	4.0	..	..	11.0	2.0	..	..	..	—	39.0	—
75	—	—	—	3.0	0.2	8.0	0.1	0.1	7.0	1.0	0.3	0.3	0.5	—	20.5	туман (2)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	1.0	..	9.0	0.5	..	7.0	2.0	2.0	0.1	0.1	—	21.7	туман (4, 5)
—	—	—	—	11.0	5.0	1.0	0.1	0.1	7.0	3.0	0.2	0.1	0.1	—	27.6	—
84	—	—	—	6.0	0.5	5.0	0.1	..	7.0	3.0	5.0	0.1	0.6	—	27.3	туман (3, 4, 5, 10)
84	8	—4	9	0.3	0.6	5.0	0.3	..	5.0	3.0	2.0	0.2	1.0	—	17.4	туман (2,3,4,5), мяцеліц
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
84	—	—	—	2.0	..	4.0	1.0	2.0	4.0	3.0	1.0	..	0.3	—	17.3	туман (3)
85	—	—	—	..	..	1.0	2.0	6.0	..	5.0	6.0	..	..	—	20.0	—
78	—	—6	10	13.0	2.0	5.0	..	..	5.0	3.0	2.0	..	..	—	30.0	туман (3)
86	14	—5	9	13.0	0.3	4.0	..	..	4.0	3.0	0.3	0.1	..	—	24.7	туман (3,5)
—	—	—	—	0.2	2.0	3.0	8.0	0.2	5.0	5.0	0.3	0.1	0.1	—	23.9	—
80	—	—6	6	1.0	0.3	3.0	..	..	3.0	4.0	..	1.0	3.0	—	15.3	туман (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
77	17	—7	6	21.0	0.4	1.0	1.0	0.3	4.0	..	..	5.0	4.0	—	36.7	туман (4, 5)
84	—	—	—	14.0	1.0	4.0	..	..	8.0	5.0	1.0	..	..	—	33.0	туман (5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
82	—	—	—	22.0	2.0	2.0	1.0	..	4.0	6.0	0.4	..	..	—	37.4	туман (3)
—	—	—	—	15.0	1.0	4.0	5.0	0.1	3.0	6.0	0.6	0.1	..	—	34.8	туман (4, 5)
78	14	—6	8	21.0	..	1.0	3.0	0.2	2.0	4.0	0.3	..	..	—	31.5	туман (5)
83	—	—	—	25.0	0.1	2.0	4.0	1.0	..	..	..	..	..	—	32.1	—
75	—	—	—	3.0	0.1	6.0	5.0	0.3	1.0	5.0	..	..	6.0	—	26.4	туман (1, 4)
84	—	—	—	11.0	..	0.2	5.0	1.0	..	5.0	0.1	..	..	—	22.3	туман (4, 6)
76	—	—	—	9.0	..	1.0	2.0	6.0	..	6.0	1.0	0.1	..	—	25.1	—
—	—	—	—	22.0	..	4.0	5.0	9.0	..	5.0	0.4	..	..	—	45.4	туман (4, 5)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
82	8	—2	9	22.0	0.2	1.0	8.0	1.0	..	2.0	1.0	..	..	—	35.2	туман (3,6)
81	—	—3	9	14.0	..	0.2	6.0	1.0	0.1	6.0	2.0	..	0.1	—	29.4	туман (10)
75	12	—3	10	26.0	0.2	0.1	3.0	5.0	0.1	2.0	0.1	0.1	0.1	—	36.7	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 1—10 лістапада 1933 г.

Кліматычныя раёны	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-бальнай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхновага пласта глебы (на глыб. 10—15 см.)
I. Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	SW	4	SW	7	—	9	8	мокрая
	3	Полацак	SW	4	SW	7	—	8	8	вільготная
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	мерзлая
	7	Нова-Каралёва	S	4	S	10	4	9	8	мокрая
II. Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	SW	4	NW	12	—	8	8	мокрая
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	SW	4	SW	10	—	8	8	замёрзшая
	16	Менск	SW	4	SW	7	—	8	8	мокрая
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	S	4	S	12	—	8	6	мокрая
	25	Асіпавічы	SW	4	NW	12	—	8	6	•
	10	Орша	SW	4	SW	7	—	10	8	замёрзшая
	19	Горкі	SW	4	NE	10	—	9	8	мокрая
III. Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	SW	4	SW	12	—	8	8	мокрая
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	S	—	S	12	—	10	9	мокрая
	21	Магілеў	SW	4	SW	10	—	9	8	замёрзшая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	NW	12	—	10	8	замёрзшая
	171	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	•
	31	Турск	W	5	W	7	—	8	8	вільготная
	32	Жлобін	SW	4	SW	10	—	8	6	•
IV. Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	W	4	SW	10	—	8	8	вільготная
	37	Калінкавічы	S	4	SW	10	—	8	6	—
	39	Лельчыцы	SW	4	SW	7	—	10	8	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	38	Гомель	E	4	E	12	—	10	9	сухая
	35	Васілевічы	SW	4	SW	10	21	8	8	•
	40	Людвінава	W	4	NW	10	—	—	—	вільготная
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—

тэмпературах ад +2 да +5° ноччу. Гэты цыклоń хутка змяшчаючыся на ўсход уступіў сваё месца вобласці павышанага ціску, якая складаецца з мас кантынентальнага палярнага паветра, што 6-га выклікала ў БССР воблачнае без ападкаў надвор'е.

7 і 8 ліку, наадварот, па Беларусі наглядалася пахмурнае і вельмі дажджлівае са снегам надвор'е, якое было абумоўлена тым, што з боку Скандынавіі, праз Балтыцкае мора, на Фінляндыю рухаўся глыбокі цыклон, які, складаючыся з мас марскога палярнага паветра, распаўсюджваўся на тэрыторыю Беларусі. У гэты момант праз Беларусь праходзіць фронт аклюзіі, які і выклікаў выпадзенне значных дажджоў і снегу і невялікае павышэнне т-ры паветра. У апошнія два дні тэрыторыя БССР ужо знаходзілася пад уплывам халодных мас марскога арктычнага паветра, якое змяшчалася ў тыл цыклона і ўтварала вобласць павышанага ціску—антыцыклон, які рухаючыся ва ўсходнім напрамку распаўсюджваўся і на Беларусь, што выклікала паніжэнне т-ры ноччу да —3, —1° і спыненне ападкаў.

Наогул гэта дэкада характарна пахмурным і дажджлівым надвор'ем і хуткімі зменамі барычных вобласцяй.

Я. Івашчанка.

МЕТЭАРАЛАГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 1—10 лістапада 1933 г.

Тэмпература паветра з пачатку дэкады трымаецца досыць высокая ў межах ад 4 ад 9°, прычым павышаецца з паўночнага захада на паўднёвы ўсход. Потым пачынаецца паступовае зніжэнне тэмпературы і к 8-му мясцамі наглядаецца пераход да адмоўных велічынь. У астатнія дні тэмпература хістаецца каля 0° і толькі ў паўднёвай зоне яна раўна 1—2°. Сярэдняя дэкадная тэмпература хістаецца ад 2 да 4°, нармальныя-ж тэмпературы хістаюцца ад 1 да 2°. Такім чынам гэта дэкада была параўнаўча цёплая. Максімальная тэмпература хісталася ад 8 да 12°. Мінімальная—ад —1 да —3°.

Ападкаў выпалі значныя колькасці ў параўнанні з нармальнымі для лістапада сумамі (40—50 мм), а іменна ў паўночна-заходняй палове БССР выпала, прыблізна, ад 15 да 25 мм, а ў паўднёва-ўсходняй ад 25 да 40 мм. Асабліва значныя сумы ападкаў выпалі ў першы дзень, шмат дзе яны перавышалі 20 мм. Потым даволі значныя ападкі наглядаліся на поўдні 4-га і па ўсёй БССР 6-га і 7-га. Наогул трэба сказаць, што на працягу ўсёй дэкады наглядалася пераважна хмарнае і вільготнае надвор'е.

Пераважаючыя вятры былі паўднёва-заходняга напрамку, з сярэднімі хуткасцямі 4 м/сек.

Воблачнасць складала ад 80 да 100% агульнага пакрыцця неба. Усе станцыі адзначаюць туманы.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметэаралагічная характарыстыка за дэкаду.

У першыя два дні дэкады вегетацыя азімых працягвалася толькі ў паўднёва-ўсходняй частцы БССР (Гомель, Васілевічы, Людвінава).

Па ўсёй тэрыторыі БССР тэмпература з пачатку дэкады была досыць нізкая, у паасобныя дні нават адмоўная (некаторымі метстанцыямі адзначаецца мерзлая глеба), таму вегетацыя азімых, якія ў другую дэкаду знаходзяцца ў фазе кушчэння, ужо спынена. Становішча іх метстанцыямі ацэньваецца баламі 3-4, пераважна 3.

Значная колькасць ападкаў, выпаўшых у адзначаную дэкаду, сведчыць, што глеба пойдзе пад снег з дастатковым запасам вільгаці.

Становішча папасаў пагоршылася ў выніку празмерных ападкаў.

С. Старобіна.

АБ ВЫНІКАХ КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ МЕТСТАНЦЫЮ

Конкурсная Камісія паведамляе, што кандыдатамі на атрыманне I, II і III прэміі высунуты наступныя метстанцы: Горкі, Віцебск, Полацак, Калінкавічы, Менск, і для персанальнага прэміравання—загадчыкі метстанцый Лепель, Зазер'е, Стара-Барысаў.

Ніжэй даюцца характарыстыкі работы гэтых станцый.

Горкі—загадчык т. Васільчанка В. І.

1. Добрая працоўная дысцыпліна.
2. Добраякаснае правядзенне і апрацоўка ўсіх агульна-метэаралагічных назіранняў, уключаючы апрацоўку ўсіх самапісцаў.
3. Чоткае і высокаякаснае абслугоўванне аэрадромаў (водзыў Нач. АМС Аршанскага аэрадрома).
4. Дабраякасныя сельска-гаспадарчыя і дарожна-сінаптычныя назіранні.
5. Добрая работа па выдачы даведак і па правядзенні экскурсій.
6. Добра наладжана служба замаразкаў, папярэджанні перадаюцца па тэлефону ва ўсе акружаючыя сельсоветы.
7. Вядзецца (т. Васільчанкам) прадраканне надвор'я па мясцовым прыкметам. З 47 дадзеных прагнозаў (пераважна па ападкам) не апраўдалася толькі 5 (водзыў соўгаса № 56).
8. Па ўласнай ініцыятыве т. Васільчанка, апошнім праводзіцца даследчая праца па вызначэнні ходу тэмпературы ў прыземным пласту паветра.
9. За час конкурса т. Васільчанка даў рацпрапанову па апрацоўцы самапісцаў (пераважна тэрмографа). Дзве другія рацпрапановы былі дадзены раней.
10. Сваечасова праведзен рамонт метстанцы.
11. Наладжана праца тэхгуртка.
12. Падпіска на пазыку складае 77,8%. Не падпісаўся т. Сцефановіч.

Полацак—заг. т. Чапурны К. П.

1. Добрая працоўная дысцыпліна.
2. Добраякаснае правядзенне ўсіх назіранняў і іх апрацоўка.
3. Асваенне аэралагічных назіранняў.
4. Чоткая пастаноўка абслугоўвання аэрадромаў (водзывы Нач. АМС Аршанскага і Віцебскага аэрадрома).
5. Высокая якасць сінаптычных тэлеграм.
6. Чоткае абслугоўванне чыгуначнага транспарта.
7. Чоткае ўсваенне ўказанняў і хуткая іх рэалізацыя на месцы.
8. Наладжана праца тэхгуртка.
9. Праводзіцца індывідуальнае соцспаборніцтва.
10. Падпіска на пазыку складае 107,8% ад агульнай сумы зарплаты. Падпіскай ахоплен увесь калектыў.

Віцебск—заг. ст. тав. Фільрозэ Ф. В.

1. Добрая працоўная дысцыпліна.
2. Поўнае і добраякаснае правядзенне ўсіх назіранняў і іх апрацоўка, уключаючы апрацоўку самапісцаў.
3. Высокая якасць зашыфроўкі сінаптычных тэлеграм.
4. Добра наладжана служба замаразкаў, прадраканні па тэлефону перадаюцца прыгарадным гаспадаркам.
5. Добра наладжана служба лінейнай інфармацыі.
6. Добра наладжана выдача даведак і правядзенне экскурсій.
7. Арганізавана індывідуальнае соцспаборніцтва.
8. Наладжана праца тэхгуртка.
9. Падпіска на пазыку складае 103,9% ад агульнай месячнай сумы зарплаты метстанцыі. Падпіскай ахоплен увесь калектыў.

Калінкавічы—заг. ст. т. Булаўка П.

1. Добрая працоўная дысцыпліна.
2. Добраякаснае правядзенне назіранняў і іх апрацоўка.
3. Чоткае абслугоўванне чыгуначнага транспарта і аэрадромаў (згодна вуснага водзыву Нач. АМС Бабруйскага аэрадрома).
4. Планава працуе тэхгурток.
5. За час конкурса сістэматычна праводзілася трэніроўка персонала станцыі па рабоце ў процігазах (ініцыятыва т. Булаўка).
6. Падпіска на пазыку складае 105,8% агульнай сумы зарплаты. Падпіскай ахоплен увесь персанал.

Менск—заг. ст. т. Бардзілоўскі.

1. Добрая працоўная дысцыпліна.
2. Поўнае і добраякаснае правядзенне назіранняў і высокаякасная іх апрацоўка, уключаючы ўсе віды самапісцаў і аэралагічныя назіранні.
3. Добра наладжана служба лінейнай інфармацыі, а таксама і абслугоўванне аэрадромаў як рэгулярнай інфармацыяй, так і па спецыяльных запатрабаваннях.
4. Наладжана перадача прагнозаў надвор'я, якія даюцца Бел. Бюро Надвор'я.

5. Наладжана індывідуальнае соцспаборніцтва.

6. Значная работа па правядзенню экскурсій (т. Бардзілоўскі), за 10 м-цаў праведзена 7 экскурсій.

7. Зацікаўленасць і добраякаснасць у працы па падрыхтоўцы назіральнікаў пры метстанцыі (т. Бардзілоўскім).

8. Падпіска на пазыку.

Тав. Байгодзін П. В.—заг. м. ст. Стара-Барысаў.

1. Добраякасныя агульна-метэаралагічныя і дарожна-сінаптычныя назіранні.

2. Добра наладжана служба замаразкаў.

3. Зацікаўленасць працай, добрае аўладанне тэхнікай і падвышэнне свае кваліфікацыі.

4. Змяшчэнне ў мясцовым друку „Бальшавік Барысаўшчыны" па сваёй ініцыятыве артыкула „Метэаралогія на службу ураджаю".

Тав. Герман Л. Я.—заг. м. ст. Лепель.

1. Няўхільнае наладжванне працы мет. ст. і яскравы ўздым у яе працы.

2. Хуткае і вельмі значнае палепшанне якасці сінаптычных тэлеграм (якасць тэлеграм вышэй сярэдняга па БССР, а да конкурса якасць іх была на апошнім месцы).

3. Добрая арганізацыя перадачы прагнозаў калгасам і соўгасам.

Тав. Маслякова—заг. м. ст. Зазер'е.

1. Своечасовая, добраякасная і дакладная апрацоўка назіранняў.

2. Арганізацыя пункта па вызначэнню вільготнасці глебы.

3. Добраякасныя с/г назіранні і абслугоўванне Селекцыйнай Даследчай станцыі.

4. Зацікаўленасць сваёй працай, падвышэнне кваліфікацыі і энергічны клопат аб палепшанні становішча мет. станцыі.

Пасля канчатковага падвядзення вынікаў, прэміраванне адбудзецца на Першай Усебеларускай канферэнцыі загад. мет. ст., якая склікаецца ў Менску 25/XI-33 года.

Старшыня конкурснай камісіі
Кучынскі.

ЗАГАД № 79

По Галоўнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідраметслужбы БССР ад 10/XI 1933 г.

§ I

У час інспекцыі мет. ст. Сіроціна, Стукачова, Дрыса старшым інспектарам Гімеіна тав. Нікіфаровічам Е. І. выяўлена наступнае:

1. Назіранні на мет. ст. Сіроціна робяцца не заўсёды ў вызначаныя тэрміны.

2. Назіранні а 21 гадзіне 20 верасня не былі запісаны ў асноўную мет. кніжку, былі запісаны ў прысутнасці старшага інспектара, раўняючыся на назіранні а 7 і 13 гадзіне гэтага дня. А 7-й гадз. 21 верасня назіранні таксама не былі запісаны ў асноўную мет. кніжку.

3. Не было зменена дажджамернае вядро і не вымяраліся ападкі за мінулы дзень у той час, калі яны былі.

4. Нядобраякасна праводзяцца назіранні над ветрам і ападкамі.

5. Выходзячы з адзначанага абʼявіць заг. мет. стан. т. Поппэ К. А. суровую вымову з папярэджаннем, што калі гэта паўторыцца яшчэ раз, то тав. Поппэ К. А. будзе зняты з працы і прыцягнут да суровай адказнасці.

§ II

1. На мет. ст. Стукачова адсутнічала сувязь з калгасамі, с/с, і з боку загадчыка ст. не прымаліся ніякія заказы, каб абслугоўваць іх мет. данымі ў часе пасеваў і ўборкі ўраджаю.

2. Не рабіўся папярэдні абход прылад, у выніку чаго адсутнічалі назіранні па змочанаму тэрмометру і вільготнасці за 4, 9, 15, 18 ліпеня і 17 жніўня 1933 г.

3. Сельска-гаспадарчыя назіранні (ажыўленне азімых, складанне дэкадных тэлеграм, устанаўленне нагляданняў над „кармавымі травамі", „пашай", развіццём раслін, прадбачанне прымаразкаў і інш.) зусім не вяліся ў 1933 годзе.

4. Вельмі дрэнна пастаўлена інвентарызацыя, у інвентарную кнігу не занесена ўся маемасць мет. стан.

5. Не ў належным парадку знаходзіцца перапіска.

6. Выходзячы з адзначанага, абʼявіць тав. Гудынскай В. І. вымову і прапанаваць ёй выканаць усе пункты, вызначаныя па акту інспекцыі тав. Нікіфаровічам ад 23/IX-33 г., звярнуўшы ўвагу галоўным чынам на абслугоўванне акаляючых калгасаў і аднаасобных гаспадарак мет. данымі і сельгас. данымі, а таксама на дарожна-сінаптычныя і феналагічныя назіранні.

§ III

Спецыялісту па тэхнічнаму забяспечанню прыладамі пры ГК АГМС тав. Каралёву за няўважлівыя адносіны да адпраўкі прылад (Стукачова—тэрмограф атрыман без спружыны да барабана, не выслана накладная на атрыманне багажа; Дрыса—нефаскоп дасланы без аднэй муфты)—абʼявіць вымову.

§ IV

Тэхніку—інспектару Гімеіна т. Англічанаву, М. Д. за фармальныя і павярхоўныя адносіны да інспекцыі мет. ст. Стукачова, які быў два разы на мет. ст. Стукачова і амаль нічога не зрабіў у сэнсе дачы інструктажа па абслугоўванню акаляючых калгасаў па сель-гасп., феналагічным і інш. назіранням, у часе інспекцыі стан. не склаў ніводнага акта аб сваёй інспекцыі—абʼявіць суровую вымову з папярэджаннем і занясеннем у працоўны спіс.

Бухгальтэрыі ўтрымаць вызначаную суму па камандыроўкам тав. Англічанава па інспекцыі мет. стан. Стукачова.

Нач. ГК АГМС БССР Мамаеў.

ЗАГАД № 127.

Па Галоўнаму Кіраўніцтву Адзінай Гідраметслужбы БССР ад 3/XI-33 г.

§ I

У мэтах забеспячэння выканання па Аддзелу Метэаралогіі намечаных тэматычных работ гэтага года, плана першапачатковай апрацоўкі мет. назіранняў і іх падрыхтоўкі да друку, а таксама работ для БВК, аслабаніць тав. Кучынскага ад кіраўніцтва групай тэхнічнай інспекцыі мет. стан., часова падпарадкаваўшы кіраўніцтва інспекцыяй тав. Кузміну—спецыялісту па абслугоўванню народнай гаспадаркі ў галіне метэаралогіі. Тав. Кузміну ўвязаць работу па інспекцыі з заг. аддзела метэаралогіі.

§ II

Для забеспячэння выканання ў 1933 годзе тэм: Вывучэнне тэмпературнага рэжыма і газаабмена снегавога насцілу і прылягаючага да яго слоя глебы ў сувязі з праблемай гібелі азімых і работы па ўстанаўленню вегетацыйных перыядаў па с. г. назіраннях 1931 і 1932 гг., тав. Рабаконя аслабаніць ад кіраўніцтва службай Ураджая ў Бюро Надвор'я і перадаць Гімеіну.

Часова да падшукання кіраўніка службы ўраджая ўскласці гэтыя абавязкі на тав. Старобіну.

Нач. ГК АГМС БССР Мамаеў.

АГЛЯД ЛІТАРАТУРЫ.

С. І. Троіцкі—„Распределение температуры и ветра в стратосфере“. Гал. Геафізічная Абсерваторыя, Ленінград, 1933 г.

У апошні час у сувязі з палётам савецкага стратастата „СССР“, які ўстанавіў сусветны рэкорд вышыні пад'ёма (19 км) і тым самым яшчэ раз паказаў, на якую недасягаемую вышыню зараз узнялася навука ў Савецкім саюзе, прадэманстраваў перад усім светам, што такі росквіт навукі магчымы толькі пры савецкай уладзе, дзе гаспадаром з'яўляецца рабочы клас, а не капіталісты; лішні раз падцвердзіў перавагу соцыялістычнай сістэмы над капіталістычнай. Гэтая сусветная перамога савецкай навукі выклікала яшчэ большы энтузіязм у працоўных Савецкага саюза да пытанняў вывучэння стратасферы і падпарадкавання яе на службу нашаму соцыялістычнаму грамадству. Але, на вялікі жаль, да гэтага часу амаль зусім не было адпаведнай літаратуры, якая-б у сістэматызаваным, сціслым выглядзе паказала, па-першае, тыя магчымасці, якія адчыняюцца перад чалавецтвам пры заваёве стратасферы, і па-другое, тыя вынікі назіранняў над стратасферай, якія набыты да гэтага часу і надрукаваны ў розных перыядычных выданнях, а гэтым самым былі мала даступны масаваму чытачу.

Першай спробай сістэматызацыі і крытычнага аналіза маючыхся метэаралагічных назіранняў у стратасферы і з'яўляецца нарыс, які складзен *С. І. Троіцкім*.

Матар'ял у гэтым нарысе падзяляецца на чатыры часткі. У першай прыведзены вынікі непасрэднага тэмпературнага зандажа стратасферы ў розных пунктах зямной кулі, а таксама размеркаванне т-ры ў часе і прасторы і змены вышыні ніжняй паверхні стратасферы на розных шыротах з паказаннем яе вагання з цягам часу, якія дасягаюць 1,6 км. У другой частцы прыводзяцца фактычныя дадзеныя аб зменах атмасфернага ціску і шчыльнасці паветра ў залежнасці ад вышыні, прычым асноўная табліца і вывады складзены на падставе дадзеных Слуцкай Аэралагічнай Абсерваторыі (пад Ленінградам). У трэцяй частцы разбіраецца размеркаванне ветра і ў апошняй паказваюцца некаторыя ўкосныя метады вывучэння стратасферы (сумеркі, серабрыстыя воблакі, метэарыты і інш.). За абмежаванасцю месца немагчыма дэталёва разгледзець некаторыя характэрныя і цікавыя вывады, але трэба адзначыць, што прыведзеныя ў нарысе дадзеныя сведчаць аб тым, што ў стратасферы, як і ў тропасферы (пласт паветра, прылягаючы да зямной паверхні), таксама ўтвараюцца хваляванні супроць шырока распаўсюджанай раней думкі, што стратасфера заўсёды знаходзіцца ў спакоі.

П. Д.

ХРОНІКА

Навуковы работнік Гімеіна БССР інж. Б. М. Лісіцкі к 1-XII канчае тэму „Ўплыў лясоў на рэжым Верхняга Дняпра“, якая распрацоўвалася па заданню СНК БССР.

—

На працягу першага паўгоддзя 1934 г. Гімеінам выдана ведамствам і ўстановам 103 даведкі навукова-тэхнічнага зместа па гідралогіі і метэаралогіі, а таксама па ўмове з Белводгасам і Белрыбтрэстам складзены 2 гідралагічныя нарысы агульным памерам у 5 друкаваных аркушоў.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.
Тэхнічны рэдактар П. Дудкін.
Члены рэдкалегіі А. Кайгарадаў, П. Бугаеў.

Друкарня БелАН. Гарліт № 2423 Заказ. № 4617. Тыраж 1000 экз. 3/4 арк.







Москва
Софийская Набережная №38
Гидрометеорологическая
станция Ц.Б.К.